**НЕАБХОДНЫ ДЛЯ КАХАННЯ ЛЕКСІЧНА-ФРАЗЕАЛАГІЧНЫ МІНІМУМ**

**1. Беларуска-рускі слоўнічак**

| | |
|---|---|
| кахаць | любить (женщину, мужчину, девушку, парня) |
| я цябе кахаю; кахаю цябе | я тебя люблю |
| любіць | любить (родителей, детей; работу; родину) |
| любаваць | любить кого-н., любоваться на кого-н. |
| кохнуць: *Кохне хлопец па дзяўчыне* | страдать от любви, чаще неразделенной |
| каханне<br>любасць<br>узаемная любасць<br>*А вазьму такую, к якой любасць чую…*<br>*(Купала)* | любовь (к женщине, к мужчине)<br><br>взаимная любовь |
| любоў<br>матчына любоў<br>любасць | любовь (к родителям, к детям; к родине)<br>материнская любовь |
| закахацца, улюбіцца, утрэскацца, укляпацца, улопацца | влюбиться |
| закаханасць, закаханыя | влюбленность, влюбленные |
| заляцацца, фліртаваць, упадаць, лазіць, валачыцца, улягаць, падбірацца, увівацца | ухаживать, флиртовать, волочиться, обхаживать,  приударять |
| заляцанне, залёты; | ухаживание, любаваць |
| залётнік | ухажер |
| любіцца, кахацца<br>*Любіліся, кахаліся, прыйшла пара – рассталіся (Нар. песьня)* | любить друг друга |
| каханы, -ая, лю́бы, -ая | любимый, -ая (о мужчине и женщине) |
| нялюбы, -ая | нелюбимый, -ая |
| каханак, каханка, каханкі | возлюбленный, -ая, -ые<br>любовник, любовница, любовники |
| любка, каханачка | любимая |
| шчасце | счастье |
| шчаслівы, -ая, шчасны, -ая | счастливый, -ая |
| захапленне | восхищение |
| замілаванне | умиление |
| мілава́ць | миловать, ласкать |
| мілава́цца, галу́біцца | ласкаться |
| мілава́нне *Радасць і рай мілавання (Купала)* | милованье |
| мілата́ | обаяние, очарование |
| кунега, кунежыць<br>кунежлівая | нега, нежить<br>которой свойственно нежиться |
| пяшчота, пяшчотны | ласка, ласковый, нежный |

| | |
|---|---|
| песціць | нежить, баловать, ласкать |
| лашчыць | ласкать |
| кукобіць | лелеять |
| цалавацца, пацалунак | целоваться, поцелуй |
| абдымаць, абняцца, абдымкі, абдоймы | обнимать, обняться, объятия |
| *Звароты* | |
| (мая) лю́бая, любенькая, (мой) лю́бы, любенькі, любка | (моя) милая, (мой) милый |
| каханы, -ая, каханенькі, -ая | любимый, -ая |
| я́сачка | *не поддающееся переводу* |
| красачка, кветачка | *не поддающееся переводу* |
| прыгожая, гожая, гожанькая, харошая, паглядная, пекная, красная | красивая |
| прыгажун, прыгажуня, красуня | красавец,красавица |
| прывабнасць, краса, хараство, чароўнасць, чары | прелесть |
| чараўніца, чароўная | *(тут:)* прелестница, прелестная |
| зграбная | стройная |
| прывабная | привлекательная |
| павабная, панадная | соблазнительная |
| цнота, цнатлівасць | невинность |
| вабноты | прелести |
| спакуса, спакуснік, -ніца | искушение, искуситель, -ница |
| палкі, гарачы; жарсны | страстный |
| шалёнае каханне, любошчы | страстная любовь |
| жарсць, пал; корць (*адсюль* мне карціць) | страсть |
| юр, юрнасць | сладострастие<br>похоть, сладострастие |
| распуснік, блудні́к, юрлівец, бабздыр, бугай, кныр, кот марцовы (*Колас*) | распутник |
| зайздросціць *(каго да каго)*, паздросціць (*В. Ластоўскі*) | ревновать |
| зайздрасць, па́здрасць | ревность |
| зайздроснік, -ніца, паздроснік, -ніца, | ревнивец, -ица |
| запаздрослівы, -ая | ревнивый,  -ая |
| зару́чыны | помолвка |
| нарачоны, -ая | нареченный |
| ажаніцца (з Аленай) | жениться (на Елене) |
| узяць за жонку … | жениться на … |
| яны пабраліся, пабраліся шлюбам | они поженились |

| | |
|---|---|
| стаць да шлюбу | сочетаться браком |
| жаніх, малады | жених |
| нявеста, маладая | невеста |
| маладыя | молодожены |

**2. Прыказкі**

У каханкі смаляныя лаўкі
Да каханка ішла то ўсё скачучы, а дахаты то ўсё плачучы
Відаць па вочках, хто ходзіць уночках
Хіба чорт задумаў гэтыя залёты: ані ўночы сну, ані ўдзень работы
Чаму ж тады не прыйшоў, калі месік узышоў, чаго ж цябе прынясло, як сонейка ўзышло?
Няхай мяне той чапае, хто каханне ў сэрцы мае
Ад кахання няма спакою ні ў касцеле, ні на дзеле, ні ў пасцелі
Даганяючы не нацалуешся
Сілаю не быць мілаю
Хто каго любіць, той таго чубіць
Парачка – баран ды ярачка
Не тупай нагою: не лягу з табою
Глянеш – хоць пацалуй, а прыступішся – плюнеш
Як не бачу – душа мрэ, як убачу – з душы прэ
Раструханка не каханка
Каб той марна здох, што любіць разам двох
Кахаў Ганулю, ды ўзяў дулю
Кахаў Ядвігу, ды далі хвігу
Жураўлі прыляцелі, дзеўкі ашалелі
Вось табе на! Не хадзі адна
Доля мая чубатая: ніхто мяне не сватае
Ажаніся – кепска, не жаніся – яшчэ горш
Вярнуўся ні п'яны, ні драны, а кажа – на вясельлі быў

**3. Народныя песні**

Залаты пярсцень на мянянне,
Шаўкова хуста на ўціранне,
А красна Агатка на каханне.

Плываё голэмбі,
Летаё лабэндзі;
З нашэго кахання
Пэўна, ніц не бэндзе
*(арыя пана Быкоўскага з Купалавай "Паўлінкі")*

Каціліся вазы з гары, на даліне сталі,
любіліся, кахаліся, ды ўжо й перасталі.

Лепей буду ў моры парынаці,
Чым з нялюбым на ручнічку стаці.
Лепей буду ў моры пясок есці,
чым з нялюбым на пасадзе сесці
*(Нар. песня "Туман ярам")*

**4. Містыка**

любізнік 'приворотное зелье'

**Прысушка на зберажэнне кахання (суворая, паганская)**
Сяду я на ваўку,
вужом паганяю –
ад сэрца да поту,
каб [Марылю] [Адась]
любіў у ахвоту

**Прысушка на каханне хлопца (хрысціянская)**
Госпаду Богу памалюся, Прачыстай матары пакланюся.
На моры на лукаморы стаіць дуб, пад тым дубам дванаццаць какатоў, пад тымі какатамі дзікі камень, на тым камяні дванаццаць братцаў; яны мылі, купавалі, дванаццаць кладак клалі. Як цераз тыя кладкі вада льецца, так рабы Божыя [Ганулі] па [Ігнату] сэрца б'ецца.